# МАНЫ НЯМА

Чалавецтва сёньня перамешваецца ня толькі ў геаграфічным, але і ў гістарычным пляне. Рэлігійныя фундамэнталісты адраджаюць лад жыцьця той эпохі, калі прыйшлі ў сьвет іхныя прарокі. Квітнеюць клюбы прыхільнікаў сярэднявечнай (рыцарскай) і першабытнай (найперш індзейскай) культуры. Сярод людзей заўсёды хто-небудзь будзе жыць у Эдэме, на Дзікім Захадзе, у Рымскай імпэрыі і г. д. Усе вядомыя нам і безьліч новых стыляў жыцьця будуць існаваць паралельна — калі не ў скансэнах, дык у кібэрпрасторы і ў снах.

Валянцін Акудовіч у эсэ “Хто я? альбо Мяне не было, няма, ня будзе” прадказвае, што тэхналёгіям новай эры наканавана стварыць сытуацыю, калі ўсё быцьцё — усё мінулае, усё цяперашняе, усё будучае — ёсьць адразу (прынамсі, сэмантычна). Веданьне пра “ўсё быцьця” не скасуе пасьлядоўнага руху падзеяў, чаргі нараджэньняў і паміраньняў, але верне чалавека да бязмэтнага адбываньня жыцьця, якое, як у жывёлаў і камянёў, ня будзе мець ніякага ідэалягічнага абгрунтаваньня.

На маю думку, у выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з магілаў паўстануць ня толькі нашыя продкі, але і ўсе пахаваныя багі і духі. У сьвеце татальнага (таталітарнага?) плюралізму хопіць месца і нядаўняму культу Бацькі ўсіх народаў, і цяперашняму культу Зялёнага Джорджа, і найстаражытным татэмічным культам. Усе навуковыя гіпотэзы, сэнсацыйныя навіны і старажытныя кнігі будуць па-ранейшаму супярэчыць адна адной, але ўсе атрымаюць матэрыяльнае пацьверджаньне сваёй праўдзівасьці.

Духоўнае адраджэньне зьняверанай ва ўсім тэхнагеннае цывілізацыі пачалося зь вяртаньня цікавасьці да архаічных формаў культуры — магіі, астралёгіі, народных рамёстваў, татуіровак і г.д. Навуковыя лябараторыі шукаюць, сьледам за альхімікамі, танныя тэхналёгіі трансмутацыі мэталяў. Новы росквіт перажывае нумаралёгія: лічбавыя відэазапісы і кампутарныя гульні прывучаюць нас да думкі, што ўсе рэчы ня толькі на экране, але і ў жыцьці — ня больш чым камбінацыі лічбаў.

Магі й варажбіты маюць у масавай сьвядомасьці ня меншы аўтарытэт, чым сэкта акадэмічных навукоўцаў. Між іншым, ужо першы “кампутар”, які вынайшаў яшчэ ў XIII стагодзьдзі сьвяты Раймунда Лулій (сыстэма расфарбаваных у сымбалічныя колеры кругоў, якія пасьля раскруткі складаліся ў тую ці іншую “формулу ісьціны”), прызначаўся ня толькі для аб’ектыўнага вырашэньня багаслоўскіх спрэчак, але і для складаньня гараскопаў. Лулій займаўся таксама альхіміяй і першы ў Эўропе стварыў чарадзейны “эліксыр жыцьця” — алькаголь. Акультызм меў багата прыхільнікаў сярод заснавальнікаў сучаснае навукі (напрыклад, Ньютан захапляўся той жа альхіміяй), і, мабыць, падзел чалавечых ведаў на дзьве незалежныя галіны, што доўжыўся якія-небудзь пару стагодзьдзяў, можа быць зноў пераадолены.

Нашыя сучасьнікі адчуваюць сябе не людзьмі, а *гуманоідамі*: расплывістая форма экзыстэнцыі дапамагае лягчэй прыстасоўвацца да хуткіх пераменаў прафэсіі, моды, кан’юнктуры рынку. Адпаведна, няма асаблівага жаданьня выбіраць з навакольнага мора інфармацыі праўдзівыя, навукова абгрунтаваныя факты: сучаснага чалавека задавальняюць “фактоіды” —

аднолькава праўдападобныя міты, чуткі і навіны. Ледзь ня ўсе газэты і часопісы друкуюць матэрыялы, "зь якімі рэдакцыя можа не пагаджацца", у якіх праўдзівасьць згаданых фактаў залежыць толькі ад аўтара. Калі кожны мае права на ўласную выпадковую інтэрпрэтацыю навакольнага сьвету, мяжа паміж падманам і праўдай можа праходзіць дзе заўгодна.

У сьвеце хуткіх пераменаў чалавек адчувае сябе не аўтаномнай, а гетэраномнай істотай: "я — гэта іншы". Ён ня ўпэўнены ня толькі ў заўтрашнім дні, але і ва ўчорашнім, аднак павінен рабіць выгляд, што зьяўляецца кампэтэнтным у сваёй галіне спэцыялістам, ініцыятыўным супрацоўнікам і жыцьцялюбам. Супярэчнасьці паміж вонкавым "я" і нутраным "іншы", неабходнасьць паралельна займацца некалькімі праблемамі спараджаюць хранічны стрэс (правалы ў памяці, бяссоньне, страту цікавасьці да жыцьця). Шмат хто шукае сваё сапраўднае "я", рэгулюючы форму цела з дапамогай бодыбільдынгу, разнастайных дыетаў альбо, наадварот, злоўжываньня ежай. Стабілізаваць псыхіку можна таксама праз карэкцыю мысьленьня біятокамі мозгу здаровага чалавека альбо хімічнымі рэчывамі. Сотні мільёнаў чалавек штодня ўжываюць "пігулкі шчасьця" — антыдэпрэсанты і стымулятары. Яшчэ ня надта даўна такія лекі займалі месца толькі ў рацыёне псыхічна хворых, сёньня ж іх глынаюць — замест ранішняй кавы — людзі, што лічацца здаровымі. Зноў, як у першабытным грамадзтве, зьнікае мяжа паміж псыхічнай нормай і паталёгіяй.

Наркатычныя рэчывы, што ўжываў першабытны чалавек (у Бібліі яны згадваюцца ў вобразе яблыка), былі непасрэднай прычынай зьяўленьня ў нашых продкаў абстрактнага мысьленьня. Вядомы дыетоляг і "этнабатанік" Тэрэнс Макена называе галюцынагены і вітаміны стравамі багоў. Ён бачыць у іх адначасна старажытны і постгістарычны інструмэнт, які дазволіць нам увайсьці ў чарговы этап эвалюцыі чалавечага роду. Тысячагодзьдзі, што адзьдзяляюць нашу эпоху ад пракаветных часоў, — гэта, паводле Макены, змрочная гісторыя неўраўнаважанага "я", якога (разам з малпіным целам) мы павінны вырачыся на карысьць псыхадэлічных палётаў да зорак, віртуальных тэхналёгіяў і новага шаманізму.

Між іншым, у клясычным шаманізме спажываньне галюцынагенных рэчываў (для яснабачаньня, лячэньня хворых бязь лекаў альбо ператварэньня ў жывёлу ці птушку) не зьяўляецца абавязковым. Нашмат часьцей шаманы (на ўскраінах сьвету і ў мэгаполісах яны практыкуюць і цяпер) для абуджэньня сваіх звышнатуральных здольнасьцяў скарыстоўваюць мэдытатыўныя танцы вакол вогнішча пад рытмічныя гукі бубна. Гэтая тэхналёгія экстазу знайшла сабе новае ўвасабленьне ў электроннай музыцы сярод псыхадэлічнага мігценьня ліхтароў, якая пануе сёньня ў бальшыні начных клюбаў. Ды-джэй — гэта сучасны шаман: ягоны талент ацэньваюць паводле здольнасьці ўвесьці танцуючых (праз бясконцае паўтарэньне імі аднолькавых рухаў) у стан мэдытатыўнага трансу, у якім зьнікае падзел часу на мінуўшчыну й будучыню, а людзі й рэчы раствараюцца ў бясконцай цяперщчыне.

Выхаду сьвядомасьці за межы цела і самой рэчаіснасьці можна дасягнуць таксама праз шматгадзіннае сузіраньне зацыкленых выяваў на экране кампутара. Прыхільнікаў віртуальнае рэальнасьці мала цікавяць палітыка, мода і спорт, яны ня любяць тэлебачаньня, якое канвэерным

спосабам дасылае нам дахаты аднолькавыя выявы. Яны жывуць нібыта ў закулісьсі афіцыйнае рэчаіснасьці — жывуць ня сёньняшнім днём, а днём без чысла, як вядомы пэрсанаж Гогаля, гішпанскі кароль Аксэнці Папрышчын.

Віртуальная рэальнасьць — гэта сьвет амаль неабмежаваных магчымасьцяў, свайго кшталту амэрыканізаваная вэрсія прасторы і часу. У кібэрпадарожжы чалавек вольны сам выбіраць пасьлядоўнасьць і хуткасьць падзеяў, якія разгортваюцца перад ім. Зразумела, што навакольны сьвет з аднолькавым для ўсіх бегам часу паступова пачынае падавацца нейкай вязьніцаю, папраўча-працоўнай калёніяй агульнага рэжыму (з гледзішча першароднага граху і выгнаньня людзей на зямлю так яно, зрэшты, і ёсьць).

Досьвед штоночных блуканьняў па Інтэрнэце альбо па казачных ляндшафтах кампутарных гульняў робіць зноў актуальнымі ўяўленьні першабытных плямёнаў пра існаваньне паралельных сусьветаў. Індзейцы і аўстралійскія абарыгены вераць, што побач з нашай рэчаіснасьцю працягвае існаваць міталягічная мінуўшчына — “час мрояў”, які можна наведаць у снах альбо з дапамогаю шаманскіх прыёмаў, каб набыць дадатковыя сілы і веды.

Уяўленьне ніколі не падманвае чалавека: усё, што мы бачым нутраным зрокам, ня менш рэальнае за навакольную рэчаіснасьць. Усё, што мы думаем, малюем, апавядаем — сапраўды адбываецца недзе ў паралельных часава-прасторавых кантынуумах, у некаторых зь якіх жывуць душы нябожчыкаў, сьфінксы, цмокі ды іншыя героі мітаў і нашых сноў.

Як і лепшыя творы мастацтва, сны выглядаюць больш пераканаўча за агульную (кампрамісную) рэчаіснасьць — мабыць, таму, што сон мы праглядаем з большым даверам, чым падзеі жыцьця: там мы ня ўмеем і нават не спрабуем адзьдзяліць праўду ад маны.

Псыхадэлічныя падарожжы сьвядомасьці ілюзорныя для нас, але для сваіх пэрсанажаў яны цалкам рэальныя. З гледзішча людзей, якіх мы сустракаем у снах і мастацкіх творах, несапраўдны ня іхны сьвет, а той, зь якога прыходзім мы. Тое, што мы лічым ілюзіяй, калісьці было альбо станецца праўдаю нават для нас саміх, а для каго-небудзь і цяпер праўда. Чалавек ніколі не памыляецца. І праўда, і мана аднолькава добра адлюстроўваюць падзеі ў сьвеце — калі ня ў нашым, дык у суседнім. Нават калі сьвет існуе толькі адзін на ўсіх, мана — гэта проста несучасная праўда, запозьнены альбо заўчасны адбітак рэальнасьці.

Усялякае мастацтва па сваёй сутнасьці — рэалістычнае: яно заўжды кажа людзям праўду, але пра якую-небудзь іншую рэальнасьць. Тое, што мы называем рэчаіснасьцю, — проста найбольш блізкая да нашага цела, адначасная з намі ілюзія. А нашая праўда — найбольш звыклая, сувымерная нашаму розуму мана.

“Зь некаторымі людзьмі мы будуем стасункі на праўдзе. Зь іншымі — на мане. І гэтыя апошнія ня менш трывалыя” (Альбэр Камю). Калі б чалавек адмовіўся ўдзельнічаць у сусьветным тэатры, ён быў бы ня ў стане зразумець іншага чалавека. Гульня — свайго кшталту змазка для мысьленьня. Мы разумеем адзін аднаго таму, што абменьваемся ня толькі рэплікамі і жэстамі, але і самімі ролямі. Няздатны паставіць сябе на месца іншага чалавека і сам ніколі ня здолеў бы стацца іншым, перавыхаваць рысы асобы і твару на новы ўзор. Самападман надта часта дапамагае нам пераўзысьці саміх сябе, каб можна было адмовіцца ад яго без катастрафічных наступстваў для нашага ўзроўню жыцьця, у тым ліку інтэлектуальнага.

Асноватворчая канцэпцыя ў шаманізме, як і ў экалягічным руху, — гэта кроўная еднасьць паміж людзьмі і прыродай. Сіла шамана — гэта сіла жывёлаў, нябожчыкаў, сонца ды іншых крыніцаў экалягічна чыстай энэргіі. За дзясяткі тысяч гадоў да Дарвіна нашыя продкі ведалі, што людзі і жывёлы — сваякі. Тым ня менш першабытныя навукоўцы лічылі, што ад малпаў паходзіць толькі нязначная частка людзей, астатнія ж маюць сваімі продкамі іншыя віды жывёлаў альбо расьлінаў, прычым у кожным выпадку мелася прамежкавае эвалюцыйнае зьвяно: напаўлюдзі-напаўжывёлы ці напаўрасьліны. У некаторых народаў гэтыя татэмныя істоты так і ня здолелі (альбо не пажадалі) пазбыцца рысаў паралельнага біялягічнага віду і ператварыліся ў багоў (напрыклад, эгіпэцкі бог Гор мае галаву сокала, а багіня Шэхмэт — галаву ільвіцы).

Згодна зь іншай тэорыяй, ледзь ня ўсе жывёлы паходзяць ад чалавека: у мітах і снах яны выглядаюць як людзі і паводзяць сябе як людзі, хоць і маюць асобныя рысы, уласьцівыя сучасным жывёлам. Паступова жывёлы страцілі вонкавае падабенства з чалавекам і выракліся людзкае мовы, за што і церпяць цяпер ад дыскрымінацыі: большыня людзей лічыць іх істотамі “другога гатунку”, у лепшым выпадку — “малодшымі братамі”.

Але некаторым з нашых супляменьнікаў жывёлы маральна бліжэй, чым тыя людзі, што іх ядуць альбо рэжуць на абутак і вопратку. З гледзішча радыкальных вэгетарыянцаў (вэганаў), спажываньне прадуктаў жывёльнага паходжаньня раўнавартаснае канібалізму. Яны адмаўляюцца нават ад малака, бо дзеля рэгулярнай дойкі кароваў пастаянна гвалтуюць, а таксама ад мёду, бо ня хочуць прыгнятаць пчолаў. Усе арганізмы, ад бактэрыяў да слана, маюць роўнае права на жыцьцё, а калі-небудзь атрымаюць і тыя правы, якімі пакуль карыстаецца адно чалавек, — у тым ліку палітычныя. (Імпэратар Калігула ў свой час спрабаваў далучыць да кіраваньня дзяржавай з паўнамоцтвамі консула каня Хутканогага. Цікава адзначыць, што Калігула быў заўзятарам партыі “зялёных” і часта баляваў зь яе кіраўніцтвам у цыркавых стайнях.)

Адам быў калісьці зроблены ў той самай майстэрні, што і ўсе першабытныя жывёлы і рэчы. Мільёны гадоў чалавек быў “роўны і родны каменю, дрэву, рыбе, зьверу, птушцы. Ён быў як усе, ён быў як усё, ён быў усім, і яго не было як яго. Вольны ад самога сябе, ён жыў, як жыў, як жывуць вольнымі ад саміх сябе камень, дрэва, рыба, зьвер, птушка” (В.Акудовіч, “Хто я?”). Чалавек не дзяліў жыцьцё на сваё і астатняе: “У росьце травінкі саўдзельнічае ўвесь сусьвет” (Хасэ Артэга-й-Гасэт, “Адам у раю”). Рай (і нірвана) — там, дзе няма ні мяне, ні маны: усё, што хто-небудзь кажа, — кажа сабе сусьвет з аднаго жыцьця ў іншае.

Дрэвы, камяні і жывёлы яшчэ й сёньня жывуць у райскім садзе. У Эдэме нараджаецца і кожны чалавек, але большыню людзей, пачынаючы з Адама і Евы, выштурхоўвае адтуль нейкае загадкавае адчуваньне недастатковасьці навакольнага сьвету й недарэчнасьці ўласнага цела ў ім. У сьвеце пануе не зялёны рагаты даляр, а шматаблічны дэфіцыт. Пачаткам гісторыі было не прышэсьце (нашэсьце?) людзей на Зямлю, а адкрыцьцё суворага закону жыцьця: амаль усяго, што нам пажадаецца звыш праграмы, — няма.

Існуюць розныя варыянты адказу на пытаньне, чаму натуральныя формы чалавечага цела і інтэлекту ня надта ўдала прыстасаваныя да навакольнай рэчаіснасьці, і чаму мы, у адрозьненьне ад жывёлаў, маем

паслабленыя, не заўсёды працуючыя інстынкты. Магчыма, чалавек заблукаў і выпадкова трапіў ня ў той сьвет, у які быў пасланы, а магчыма — яшчэ немаўлём быў закінуты сюды, нібы дывэрсант, зь іншай плянэты і цяпер перабудоўвае Зямлю і ўласнае цела на ўзор эталёнаў, што засталіся на далёкай радзіме (у гэтым выпадку цывілізацыю лепш параўноўваць ня з ракавай пухлінаю, а зь інфэкцыйнай хваробай). У іншаплянэтнае паходжаньне чалавецтва верылі, напрыклад, інкі.

Доказам “закінутасьці” (падкінутасьці?) чалавека ў гэты сьвет можна лічыць уласьцівае нам жаданьне як мага лепш уладкавацца ў жыцьці за кошт суседзяў па плянэце: прыкладна гэтак жа паводзіць сябе ў чужым гнязьдзе птушанё зязюлі. Зрэшты, і альтэрнатыўнае вытворча-спажывецкай мітусьні экзыстэнцыяльнае “туканьне праўдзівага быцьця” — праз татальны нон-канфармізм, “аскезу адмаўленьня”, мэдытатыўныя ці псыхадэлічныя практыкі самапаглыбленьня — сьведчыць пра адчуваньне чалавекам свайго чужынства ў гэтых сьвеце й целе.

Сьмелую вэрсію высадкі людзей на Зямлю прапаноўвае адна зь менскіх газэтаў. Паводле яе, дакумэнтальна зафіксаваныя выпадкі “дажджоў” з жывых жабак, рыбаў і г.д. — гэта і ёсьць верагодны мэханізм зьяўленьня новых відаў альбо пашырэньня арэалу ўжо існуючых: “Гэта менавіта той шлях, якім зьявілася жыцьцё на Зямлі і якім яно падтрымліваецца. Тым самым шляхам зьявіўся й сам чалавек”. Сэнсацыі бульварных выданьняў часта выглядаюць сьмешнымі, але чым яны, па вялікім рахунку, адрозьніваюцца ад мітаў, якія дасьледуюць гісторыкі культуры і зь якіх вырасла ўся сучасная навука?

Здараецца, што зь неба падае і нешта нясконачанае, нейкая крывавая каша. “Трэба ставіцца да гэтага спакойна, — раіць газэта, — брак непазьбежны на ўсялякай вытворчасьці”. Дарэчы, шумэры тлумачылі прычыну недасканаласьці чалавечага цела тым, што бог Энкі быў моцна нападпітку, калі ляпіў з гліны першых людзей. Індзейцы з каліфарнійскага племя каўіла мяркуюць, што чалавек створаны з чорнае зямлі, якую бог Мукат дастаў з уласнага сэрца, а вось бог іракезаў Іясхека зьляпіў людзей усё ж такі з гліны — паводле свайго адлюстраваньня ў вадзе, амаль як ягоны біблейскі калега. У міталёгіі майя першы чалавек быў зроблены багамі таксама з гліны — але неўзабаве высьветлілася, што гэта малапрыдатны матэрыял: тая істота не магла паварушыцца і размаўляла бязглузда. Давялося зьнішчыць глінянага чалавека і стварыць новага з размолатых зерняў кукурузы (гэты атрымаўся аж занадта відушчы ды разумны, і бог Хуракан надзьмуў на ягоныя вочы туману, каб шмат якія рэчы заставаліся для людзей няўцямнымі).

Зразумела, што раней ці пазьней мусіў прыйсьці час, калі чалавеку надакучаць чужыя экспэрымэнты над ягоным целам і лёсам. Выбух народнага нацыяналізму, які доўжыўся на Поўначы ад рэвалюцыі ў амэрыканскіх калёніях да распаду СССР і Югаславіі, падштурхнуў некаторых назіральнікаў да парадаксальнай здагадкі, што ўсе людзі належаць да аднаго агульначалавечага племя, якое змагаецца “за нашу і вашу свабоду” не з рэакцыйнымі сіламі прыроды, а зь міжнародным хаўрусам багоў, што калянізавалі плянэту яшчэ ў дагістарычны час. Працытую Альбэра Камю: “Рэвалюцыйны дух цалкам зводзіцца да абурэньня чалавека сваёй чалавечай

доляй. Рэвалюцыя заўсёды, пачынаючы з Прамэтэя, узьнімаецца супраць багоў, тыраны ж і буржуазныя лялькі тут проста зачэпка".

У эпоху прамысловай рэвалюцыі культ Божае ласкі зьмяніўся культам чалавечага розуму: Бог памёр таму, што нарадзіўся новы бог — чалавек, ***deus ex machina***. Магчыма, біблейскі Бог і не памёр, але, прынамсі, моцна занядужаў пасьля таго як трапіў пад цягнік, а потым — пад аўтамабіль, пад танк, бамбаваньне і г.д. Кожнае новае вынаходзтва паслабляла ягоную ўладу на гэтай плянэце й надавала моцы чалавеку (адбітак таго канфлікту можна знайсьці, напрыклад, у тэксьце "Інтэрнацыяналу" Э.Пат'е: "Мы пакуль нішто, але станемся ўсім!.. Няма ніякага вышэйшага Збаўцы, дык уратуйма сябе й увесь сьвет самі!.. Зямля належыць толькі людзям, а *абібок* хай шукае сабе іншага прытулку").

Індустрыяльная рэвалюцыя мусіла вызваліць з палону ў прыроды і яе багоў ня толькі самога чалавека, але і працоўных жывёлаў. Тым ня менш людзі не адразу пагадзіліся падзяліцца здабытаю свабодай з суседзямі. Нудоту таго рэжыму самаўладзьдзя В.Акудовіч падсумаваў прыкладна так: да Тэхнагеннае эры чалавек жыў у сьвеце, створаным Прыродай альбо Богам (багамі). З усіх чатырох бакоў нас атачала рэальнасьць, якая паўставала ня з нашых жаданьняў і мазалёў. Цяпер жа ўсюды, куды вока ні кінь, не прырода, ня Бог, а ён сам — чалавек, адбіткі ягонай фізычнай альбо інтэлектуальнай працы. І, відаць, ужо немагчыма пераадолець сытуацыю непасрэдна ім створанага быцьця, якой мы неўпрыкмет адгарадзіліся ад усялякай трансцэндэнтнай сакральнай сілы, што магла б надаць сэнс чалавечаму існаваньню.

Мяркую, пераадолець сытуацыю занадта ачалавечанай рэчаіснасьці і сустрэцца з новымі багамі яшчэ магчыма. Прыхільнікі экалягічнага руху кажуць, што спыніць глябальны крызіс навакольнага асяродзьдзя можна толькі шляхам скарачэньня разоў у дзесяць колькасьці людзей на зямлі (ніякіх практычных захадаў у гэтым кірунку яны ня робяць, бо вераць, што чалавецтва само пасьпяхова вырашыць гэтую задачу). Па-другое, у навакольнай прасторы існуе багата плянэтаў, дзе мы можам сустрэцца зь нечым мацнейшым за нас. Галоўнае ж, людзі цяпер могуць быць ня толькі чалавекападобныя. Можна расьсяліць чалавека (у выглядзе генаў, ведаў ці імітаваных абрысаў цела) па ўсіх галінах эвалюцыйнага дрэва, каб кожны біялягічны від меў свой *каэфіцыент чалавечнасьці.*

На першы погляд, фізычнае растварэньне людзей ў новых разумных жывёлах і рэчах будзе азначаць самаліквідацыю, канчатковую "сьмерць Чалавека" (якую В.Акудовіч перафармуляваў у эпітафію "Мяне няма"), але можна бачыць тут і элегантны праект *Другога прышэсьця* чалавека на плянэту праз гуманізацыю ўсіх жывых і пакуль нежывых істотаў.

Ня выключана, што ўжо ў гэтым стагодзьдзі цяперашнія людзі зьнікнуць: вымруць, як дыназаўры, ад невядомай хваробы ці ад нуды, уцякуць ад праблемаў уцялесьненага жыцьця ў штучны рай кібэрпрасторы альбо проста разьедуцца па іншых плянэтах. Але можна спадзявацца, што створаныя намі да таго часу разумныя жывёлы і рэчы пастулова ўзгадуюць новую генэрацыю "клясычных" людзей — спачатку дзікіх, потым свойскіх і, нарэшце, роўных сабе.